# I. МЕДЫЯЛІНГВІСТЫКА. МОВА. МАЎЛЕННЕ

**Вольга Бардзіян**
*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт*
*(г. Мінск, Беларусь)*

## АРХІТЭКТАНІЧНАЯ ФУНКЦЫЯ МОЎНЫХ АДЗІНАК У ПУБЛІЦЫСТЫЧНЫМ ТЭКСЦЕ

У артыкуле коратка падаецца азначэнне тэксту як зыходнага элемента вербальных зносінаў, акрэсліваецца архітэктанічная роля моўных адзінак у структурнай арганізацыі мастацкага цэлага на публіцыстычным матэрыяле газеты «Рэспубліка».

*Ключавыя словы:* архітэктоніка; функцыя лейтматыву; дыскрэтныя адзінкі; кампазіцыя твора; тэкст; жанр; публіцыстычны стыль.

Галоўнае прызначэнне публіцыстыкі – узняць грамадска-сацыяльныя і актуальныя пытанні сучаснага жыцця, пры гэтым асноўнай задачай публіцыстычнага тэксту з’яўляецца падача звестак, якія ўздзейнічаюць на чытацкую аўдыторыю. Сфера ж выкарыстання публіцыстычных матэрыялаў – сродкі масавай камунікацыі (газеты, часопісы, радыё, тэлебачанне і інтэрнэт). Пісьменніцкая публіцыстыка з’яўляецца часткай літаратуры, гэта жанр твораў, якія стаяць на стыку мастацкай сацыяльна-палітычнай прозы.

Калі гаварыць пра стылістыку тэксту любога мастацкага і немастацкага твора, неабходна адзначыць мнагамернасць яго структуры, што вызначаецца шэрагам кампанентаў. Сярод гэтых катэгорый можна вылучыць вялікую ролю архітэктонікі, якая дазваляе ўпарадкаваць, структураваць асобныя члены твора ў адно цэлае.

Важная роля ў любым кантэксце звычайна адводзіцца слову, хаця не менш значную функцыю выконвае кожная кампазіцыйная частка, якая выдзяляе найважнейшыя сэнсавыя адрэзкі тэксту не толькі каб актывізаваць увагу адрасата, а, галоўнае, каб асэнсаваць яго складнікі ва ўзаемаадносінах у кантэксце цэлага і непарыўнага адзінства. Гэта, у першую чаргу, розныя графічныя выдзяленні, а таксама моцныя

пазіцыі тэксту або яго кампазіцыйныя часткі, якія якраз і вызначаюць іерархію сэнсу.

Паводле сучасных лінгвістычных падыходаў, зыходным элементам вербальных зносін ёсць тэкст. Тэкст – «тая моўная адзінка, якая выступае ў камунікацыі як адносна завершаны адрэзак адносінаў, – адзіная структураваная і арганізаваная паводле пэўных правілаў, што нясе кагнітыўную, інфармацыйную, псіхалагічную, сацыяльную нагрузку зносінаў» [2, с. 89]. Пры лінгвістычным аналізе любога твора, мастацкага і немастацкага, важна ўбачыць і адзначыць «узаемасувязь і ўзаемадзеянне паміж моўнымі адзінкамі ў сістэме ўсяго мастацкага цэлага і ясна бачыць перспектывы развіцця вобразнага мыслення аўтара» [4, с. 106]. Значная ролю ў гэтым адводзіцца архітэктоніцы – спалучэнню частак у адно стройнае цэлае, інакш – кампазіцыі любога твора. М. М. Кім так акрэслівае гэтую з’яву: «Архітэктоніка – не толькі структуравызначальная, але таксама і найважнейшая эстэтычная катэгорыя. Яна прадугледжвае і вызначае ўзровень мастацтва пабудовы, узаемаадносін элементаў у сістэме з пазіцыі эстэтычнага значэння, звяртае ўвагу на агульны эстэтычны план адзінага цэлага…» [1, с. 253]. І з гэтым нельга не пагадзіцца, бо эстэтычная функцыя публіцыстычнага стылю – адна з асноўных.

В. М. Самусевіч так акрэслівае форму публіцыстычнага матэрыялу: «Калі ўнутраная (ці зместавая кампазіцыя) вызначаецца найперш сістэмай вобразаў-характараў/персанажаў, своеасаблівасцю сюжэта, фактамі і дэталямі, то знешняя (архітэктоніка) – гэта чляненне тэксту на дыскрэтныя адзінкі. Да архітэктонікі мы аднясём памер, структуру твора, візуальнае аздабленне матэрыялу, а да ўнутранай – задуму, тэму, ідэю, настрой, адносіны да жыццёвага матэрыялу» [3, с. 99].

На думку стыліста М. Я. Цікоцкага, ключавым элементам, які аб’ядноўвае ў адзінае цэлае фрагменты тэксту ці ўвесь твор, з’яўляюцца апорныя ў сэнсавых адносінах словы і больш буйныя моўныя адзінкі, якія не толькі падпарадкоўваюцца мастацкаму кантэксту, але і актыўна ствараюць яго [4, с. 106]. Зразумела ж, што выбар кампазіцыйнай пабудовы любога публіцыстычнага тэксту дыктуецца пэўнымі ўмовамі: сацыяльнай мэтай, жыццёвым матэрыялам і творчымі магчымасцямі аўтара.

Цікавым у гэтых адносінах падаецца публіцыстычны матэрыял Паліны Лосевай «Лекі з вострава Пасхі» пад рубрыкай «Медыцынскія даследаванні». Ужо з падзагалоўка і загалоўка слова «лекі» адкрывае тэму матэрыялу, а слова «антыбіётык» сэнсава дапаўняе і ўдакладняе актуальнасць зместу расповеду. І ў лідзе аўтар уводзіць ёмістае спалу-

чэнне «лекавы прэпарат рапаміцын» і адразу тут жа яшчэ адну адзінку «таблеткі ад старасці». Пры далейшым чытанні назіраем, што менавіта гэтыя моўныя элементы і ёсць скразныя па ўсім матэрыяле, якія факусіруюць увагу чытача на самым важным аспекце ўсяго твора. Незалежна ад таго, што не выдзяляюцца аўтарам спецыяльнымі сродкамі, яны прыцягваюць увагу і заахвочваюць дазнацца больш глыбока пра гэты антыбіётык і яго медыцынскую функцыю. Дапамагаюць устанаўленню ўнутраных сувязей у першых дзвюх частках спадарожнікі ключавых згаданых слоў і спалучэнняў новыя найменні медыцынскай галіны, якія больш глыбока раскрываюць сутнасць вынаходніцтва і прымянення гэтага прэпарату: «імунітэт – імунная сістэма»; «рак – пухліна»; «клеткі – імунныя клеткі – пухлінныя клеткі». Гэтыя элементы-спадарожнікі згаданых вышэй ключавых адзінак надаюць эмацыянальна-стылявую пераканаўчасць і, звязваючы ў адзінае кампазіцыйнае складанае цэлае першыя дзве часткі ўсяго тэксту, выконваюць архітэктанічную функцыю.

Незвычайна, вобразна падаюцца аўтаркай ключавыя словы ў канве тэксту: «…калі мы хочам перасадзіць у арганізм чужародны орган або тканку, супраць якіх імунітэт разгорне абарону»; «менавіта прымяненне рапаміцыну пры трансплантацыях нырак забяспечыла яму дарогу ў клінікі…», што таксама забяспечвае кампазіцыйна-экспрэсіўную функцыю архітэктанічных элементаў.

Ключавыя моўныя адзінкі выконваюць у тэксце функцыю лейтматыву. Па-за тэкстам, узятыя асобна, яны могуць здацца недарэчнымі, у сістэме ж пададзенага матэрыялу займаюць свае пэўныя месцы і разам з іншымі лексічнымі кампанентамі ўзмацняюць уздзеянне ўсяго тэксту на чытача.

У трэцяй частцы матэрыялу ўзнікаюць новыя спадарожнікі ключавых элементаў: «антыцела»; «плацэба»; «падвыпрабавальныя», побач з якімі ўзмацняецца функцыя лейтматыву ключавых адзінак. Разам з тым аўтар уводзіць сінанімічныя папярэднім словаспалучэнні: «таблеткі ад старасці – элексір вечнай маладосці»; «аналагі рапаміцыну – эфектыўныя стымулятары імунітэту». Гэта дазваляе ўспрымаць увесь тэкст цалкам, як адзінае непадзельнае, у якім толькі ў спалучэнні ўсіх сінтаксічных складаных цэлых выразна прасочваецца стылёва-экспрэсіўная і кампазіцыйная функцыя ключавых архітэктанічных моўных адзінак. Важным кампазіцыйным фактам выступаюць і заключныя сказы ў апошнім абзацы, што як бы закрываюць тэму, разгорнутую ў загалоўку, падзагалоўку і лідзе, і ўтрымліваюць асноўныя скразныя моўныя элементы. Выконваючы кампазіцыйную ролю і

ідэйна-эстэтычную функцыю матэрыялу, яны паўтараюцца на працягу ўсяго тэксту і ўспрымаюцца чытачом проста, даступна і разам з іншымі моўнымі сродкамі ствараюць якаснае кампазіцыйна-сэнсавае адзінства.

Трэба адзначыць факт спалучэння кампазіцыйнага афармлення і тэксту, і ўсёй старонкі нумара газеты «Рэспубліка» ад 20 ліпеня 2018 года. Варта нагадаць думку В. М. Самусевіч: «Для журналісцкай творчасці важная такая якасць, як цэласнасць успрымання. Цэласнасць успрымання неабходная як пры кампазіцыйнай пабудове твора, калі журналіст імкнецца да гарманічнага спалучэння розных частак тэксту, так і пры мадэляванні нумара, калі рэдактар праектуе яго структуру, адбірае актуальныя матэрыялы і вызначае іх аптымальнае размяшчэнне на газетнай паласе» [3, с. 100]. Менавіта ўдалае графічнае афармленне ўсёй старонкі ўзмацняе візуальнае ўспрыняцце матэрыялу. Да месца па цэнтры размешчаная фотакартка з вытрымкай тэксту, сіметрычнае ліду размяшчэнне змястоўнай падборкі са зместу матэрыялу і ў працяг рубрыкі – фотаздымак з вострава Пасхі таксама з вытрымкай тэксту, да таго ж і шрыфтавое вылучэнне дапаўняе кампазіцыйную пабудову гэтай старонкі.

Такім чынам, можна гаварыць пра гарманічнае адзінства мадэлявання старонкі выдання і архітэктанічнае афармленненне тэксту, што актывізуе прыцягненне ўвагі чытача. Публіцыстычны твор – гэта цэласнае сістэмнае ўтварэнне, у якім усе сродкі ўспрымаюцца ва ўзаемасувязі, што прыводзіць да ўзнікнення новых сэнсавых асацыяцый успрымання інфармыцыі. Пры гэтым архітэктанічная функцыя моўных адзінак дазваляе сфакусіраваць увагу на самым актуальным, узмацніць эмацыйны і эстэтычны эфект сувязей сумежных і дыстанцыйных элементаў розных узроўняў для ўспрыняцця структурнай і сэнсавай цэласнасці тэксту.

*Бібліяграфічныя спасылкі*

1. Ким, М. М. Технология создания журналистского произведения / М. М. Ким. – СПб. : Изд-во Михайлова В. А., 2001. – 320 с.
2. Рамза, Т. Р. Сінтаксіс. Тэарэтычны курс : вучэб. дапапожнік / Т. Р. Рамза. – 2-е выд., дапрац. і дапоўн. – Мінск : БДУ, 2006. – 214 с.
3. Самусевіч, В. М. Мадэляванне карпаратыўнага выдання: кагерэнтнасць формы і зместу / В. М. Самусевіч // Корпоративная пресса в условиях конвергенции СМИ и глоболизации информационного пространства : мат-лы кр. стола, Минск, 16 марта 2017 г. / редкол. : С. В. Дубовик (отв. ред.) [и др.]. – Минск : Изд. центр БГУ, 2017. – 167 с.
4. Цікоцкі, М. Я. Стылістыка тэксту : вучэб. дапам. для студэнтаў выш. навуч. устаноў філал. профілю / М. Я. Цікоцкі. – Мінск : Беларус. навука, 2002. – 223 с.